Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-07-05

# Рарытэт у кожны дом

**Прэзентацыя электроннага дыска «Брэсцкая Біблія: да 450-годдзя выдання» прайшла ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**

**Даніла АРЦІМОВІЧ**

У чытачоў, якія ведаюць пра факсімільнае выданне шэрагу помнікаў мінулага (напрыклад, Слуцкага Евангелля), можа ўзнікнуць пытанне: чаму ЦНБ пайшла іншым шляхам? Як патлумачыў загадчык аддзела рэдкай кнігі і рукапісаў ЦНБ Аляксандр Сцефановіч, выпуск факсіміле з'яўляецца надзвычай дарагім. Акрамя таго, установа свядома пайшла на такі крок, каб паўнатэкставая электронная версія гэтага рэдкага выдання дайшла да шырокай аўдыторыі. На DVD прадстаўлены сама Біблія, якую можна гартаць пастаронкава, артыкулы пра гісторыю яе стварэння, тыпаграфію Радзівілаў і пра асобнікі выдання. Прадстаўлена характарыстыка кожнай старонкі Бібліі. Каб пашырыць кола чытачоў, на дыску змешчана навукова-папулярная прэзентацыя. А прагляд матэрыялаў суправаджаецца класічнай рэнесанснай музыкай.

Праект абыўся дзякуючы фінансавай падтрымцы ААТ «Белаграпрамбанк» і плённаму супрацоўніцтву з бібліятэкай імя Урублеўскіх Літоўскай акадэміі навук. Як нагадаў А. Сцефановіч, пасля Рэфармацыі ў ВКЛ прыйшла Контррэфармацыя. Каб выратаваць асобнікі «Брэсцкай Бібліі», якія знішчаліся, даводзілася вырываць першую і апошнюю старонкі. Таму поўных асобнікаў амаль нідзе няма. Адзін з іх захоўваецца ў Бібліятэцы Урублеўскіх. Калі рабілася алічбоўка, якую ажыццявіў Беларускі навукова-даследчы цэнтр электроннай дакументацыі, дык супрацоўнікі ЦНБ папрасілі літоўцаў зрабіць копіі старонак, якіх не хапала.

Падчас прэзентацыі адбылося адкрыццё выстаўкі «Брэсцкая Біблія — шэдэўр кнігадруку XVI ст.», на якой былі прадстаўлены арыгінальнае выданне, а таксама даследаванні, прысвечаныя Брэсцкай Бібліі і Мікалаю Радзівілу Чорнаму.

Пасля завяршэння імпрэзы прадстаўнікі буйных бібліятэк і іншых устаноў навукі, адукацыі і культуры атрымалі экзэмпляры электроннага дыска ў падарунак.